Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”

Кафедра гісторыі Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ (АД СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА КАСТРЫЧНІКА 1917 ГОДА)

*Матэрыялы Рэспубліканскай*
*навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*
г. Мінск, 28 сакавіка 2008 г.

Мінск, 2008

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэдкалегія:

першы прарэктар БДПУ, старшыня арганізацыйнага камітэта канферэнцыі *А.І. Андарала*;

кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ *І.І. Багдановіч*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *І.В. Варывончык*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А.П. Жытко*;

доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М.М. Забаўскі*;

кандыдат гістарычных навук, старшы выкладчык *З.І. Канапацкая*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ *Г.А. Космач*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А.М. Люты*;

доктар гістарычных навук, дацэнт *М.І. Мініцкі*;

начальнік вучэбна-выдавецкага цэнтра БДПУ *В.Я. Навагродскі*;

доктар гістарычных навук, прафесар *В.А. Пілецкі* (адк. рэд.);

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.Ф. Рацько*;

доктар гістарычных навук, прафесар *М.К. Сакалоў*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *М.М. Сакалоў*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.Г. Субоцін*;

доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ *У.В. Тугай*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *П.А. Тупік*;

доктар гістарычных навук, прафесар *В.М. Фамін*;

доктар гістарычных навук, прафесар *І.Р. Чыкалава*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Л.Л. Шкуцько*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# СУЧАСНАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПЫТАННЯ Ў ДЗЕЙНАСЦІ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЫ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў 1906 – 1917 гг.

П.А. Трубчык, г. Мінск

З пачатку 1990-х гг. нацыянальная праблематыка знаходзіць усё больш прыкметнае месца ў гісторыка-палітычнай літаратуры. У полі зроку даследчыкаў аказваюцца нацыянальныя праграмы палітычных партый [1], што выводзіць на комплексны аналіз нацыянальнага пытання ў Расійскай імперыі і яго адлюстраванне ў Думе.

Так, аналізуючы ліберальную мадэль перабудовы Расійскай імперыі, Шалахаеў У.В. вылучыў у асобную главу сваёй манаграфіі пастаноўку і варыянты вырашэння нацыянальнай праблемы. Ён прыйшоў да высновы, што, нягледзячы на рознагалоссі ў асяроддзі лібералаў, распрацаваны імі варыянт вырашэння нацыянальнага пытання гарантаваў правы і свабоды асобы “у сферы культурна-нацыянальных адносін”. Будучы разлічаным на “кампраміс і ўзаемаразуменне” гэты варыянт, на думку аўтара, даваў “рэальную магчымасць пазбегнуць насільнага вырашэння нацыянальнай праблемы”[2, с. 112 – 113].

Месца нацыянальнага пытання ва ўнутранай палітыцы царызму ў пачатку ХХ ст. на аснове комплексу архіўных і іншых дакументаў прааналізаваў у сваіх артыкулах і манаграфіі В.С. Дзякін. Ён звярнуў увагу на імкненне народаў у імперыі да самастойнага развіцця і адзначыў, што “…грубыя прыёмы падаўлення нацыянальных рухаў давалі толькі адваротны вынік, садзейнічаючы радыкалізацыі такіх рухаў і выцясненню іх умераных лідэраў …” [3, с. 60-61]. У калектыўнай манаграфіі “Национальная политика России: история и современность” адносіны дзяржавы і народаў у Расійскай імперыі прысвечана спецыяльная глава, дзе звернута ўвага на адлюстраванне нацыянальнага пытання ў праграмах розных палітычных партый. Па падліках аўтараў, сярод дэпутатаў IV Думы ад губерняў Прыбалтыкі, Украіны, Беларусі, Малдавіі больш 90% складалі прыхільнікі “адзінай і непадзельнай ” Расіі [4, с. 178, 180].

Даследчыкі І.К. Кір’янаў і М.Н. Лук’янаў, разглядаючы сацыяльна-культурныя рысы дэпутатаў Думы другога, трэцяга і чацвёртага скліканняў, падкрэслівалі, што сярод дэпутатаў Думы “абсалютна пераважалі прадстаўнікі прывілеяваных нацыянальных і канфесійных груп: рускія, маларосы, беларусы (74,1% - у другой, 84,7% - у трэйцяй) праваслаўныя (адпаведна 77 і 85,6%)”, а ў Чацвёртай думе рускіх, маларосаў і беларусаў было 86,4%, а праваслаўных 87,8%. Абагульняючы статыстычныя матэрыялы, аўтары звяртаюць увагу, што “найбольшай устойлівасцю адрозніваюцца нацыянальна-рэгіянальна-канфесійныя групы (мусульманская, польскае кола, польска-літоўска-беларуская)” [5, с. 83, 96-97, 87].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Д.А. Дземін, цэнтрам свайго даследавання, зрабіў гісторыю стварэння і функцыянавання Дзяржаўнай думы ў Расіі, таксама звярнуў увагу на этнічны і рэгіянальны аспект няроўнасці выбараў і падлічыў, што па закону 11 снежня 1905 г. было створана 33 тэрытарыяльна-саслоўныя, канфесійныя і этнічныя выбарчыя акругі, канстатаваў падзел з'ездаў па нацыянальнаму прызнаку пад час выбараў у ІІІ Думу, а таксама супаставіў звесткі аб партыйнай прыналежнасці дэпутатаў Думы розных скліканняў [6, с. 13, 28, 38-41].

У калектыўнай манаграфіі “Становление российского парламентаризма начала ХХ века” [7] дадзена не толькі характарыстыка крыніц і метадаў вывучэння выбараў і работы І Думы, а таксама выдзелены асноўныя прынцыпы і асаблівасці выбараў у Паўночна-Заходніх губернях, паказаны склад Думы першага склікання і палітычныя прыярытэты яе дэпутатаў, звернута ўвага на прычыны разнагалоссяў у падліках агульнай колькасці членаў І Думы і яе партыйных фракцый, у тым ліку нярускіх дэпутатаў.

В.А. Казбаненка звярнуўся да комплекснага вывучэння працэсаў утварэння і дзейнасці думскіх фракцый Думы першых дзвюх скліканняў. Характэрызуючы этнаканфесійны склад І Думы, ён асобна вылучыў “Парламентскую групу Саюза аўтанамістаў” як “значнае дэпутатскае фарміраванне” (колькасцю ад 120 да 150 чалавек), якое не з'яўлялася адзінай палітычнай партыяй, падкрэсліў, што ўжо ў ІІ Думе “утварылася некалькі дэпутацкіх фарміраванняў па нацыянальна-тэрытарыяльнаму прызнаку” [8, с. 68, 70, 108].

Увагу сучасных даследчыкаў прыцягвае практыка думскай законатворчасці па нацыянальнаму пытанню. В.Ю. Зорын, С.В. Куляшоў, Д.А. Аманжолава ў манаграфіі “Национальный вопрос в Государственных думах России: опыт законотворчества” паставілі задачу “разгледзець увесь працэс дзейнасці заканадаўчых органаў улады ў вобласці рэгулявання міжнацыянальных адносін …, абагульніць стогадовы вопыт работы заканадаўчых структур у Расійскай імперыі, СССР і Расійскай Федэрацыі”. У такім разрэзе аўтары разгледзелі і законатворчасць па нацыянальнаму пытанню ў Дзяржаўнай думе Расійскай імперыі 1906 – 1917 гг., якому прысвяцілі адзін з раздзелаў кнігі. Важна, што ў ёй прааналізаваны не толькі асноўныя законапраекты па нацыянальным і рэлігійным пытаннях, але і дадзена характарыстыка многім думскім запатрабаванням, якія звычайна адлюстроўвалі шматузроўневыя і рознамаштабныя этнаканфесійныя канфлікты ў Расійскай імперыі. Аўтары прыйшлі да высновы, што прадстаўніцтва "канфесійных, нацыянальных і іншых інтарэсаў расійскага грамадства, нават абмежаванае, у заканадаўчым органе было зрухам у бок дэмакратыі", аднак практычная "неэфектыўнасць нацыянальнай палітыкі царызму ў пачатку ХХ стагоддзя падцвярджала непазбежнасць распаду манархічнай сістэмы і была адным з фактараў дальнейшай радыкалізацыі настрояў насельніцтва і дэзінтэграцыі грамадства" [9, с. 68, 70, 108].

З сярэдзіны 1990-х гадоў праблема "Нацыянальнае пытанне і Дзяржаўная дума" пачынае даследавацца не толькі ў агульнаімперскім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кантэксце, а таксама і ў лакальным. Увагі заслугоўвае манаграфія М.М. Забаўскага "Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906 – 1917 гг.)". Аўтар упершыню разгледзеў пазіцыі па нацыянальнаму пытанню дэпутатаў ад беларускіх губерняў. Акрамя таго, у працы даецца аналіз друкаваных органаў палітычных партый і груп, якія дзейнічалі ў Беларусі. Гэта дазваляе прасачыць узаемаадносіны і растаноўку палітычных сіл па нацыянальнай праблеме [10]. Думскай тактыцы Бунда ў Беларусі прысвечаны артыкул І. Яцкевіч [11]. Праблему грамадска-палітычнай барацьбы на выбарах і фарміравання думскага прадстаўніцтва беларускіх губерняў, а таксама дзейнасць дэпутатаў ад іх у Думе даследавалі М.М. Забаўскі і У.С. Пуцік [12].

Такім чынам, у цэлым даследчыкамі зроблена значная навуковая работа, асабліва па агульных праблемах думскай гісторыі. Аднак, у апошні час праяўляецца цікавасць да нацыянальнага пытання ў Думе. У сучаснай гістарыяграфіі ўзнікла неабходнасць да вывучэння Дзяржаўнай думы Расійскай імперыі ў этнаканфесійным і рэгіянальным вымярэннях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура

1. Саидкасимов С. С. Национальный вопрос в программах политических партий России // Кентавр. 1992. № 1; Шелохаев В. В. Национальный вопрос в России: либеральный вариант решения // Кентавр. 1993. №2-3, і інш.

2. Шелохаев В. В. Либеральная модель переустройства России. М., 1996.

3. Дякин В. С. Национальный вопрос во внутренней политике царизма (XIX -начало XX века) / Подгот. И. В. Лукоянов. СПб., 1998.

4. Национальная политика России: история и современность. М., 1997.

5. Кирьянов И. К., Лукьянов М. Н. Парламент самодержавной России: Государственная дума и ее депутаты. 1906-1917. Пермь. 1995.

6. Демин В. А. Государственная дума России (1906-1917): механизм функционирования. М., 1996.

7. Селувская Н. В., Бородкин Л. И., Григорьева Ю. Г. Становление российского парламентаризма начала XX века. М., 1996.

8. Козбаненко В. А. Партийные фракции в I и II Государственных думах России. 1906-1907. М., 1996.

9. Зорин В. Ю., Кулешов С. В., Аманжолова Д. А. Национальный вопрос в Государственных думах России: опыт законотворчества. М., 1999. С. 6, 200.

10. Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906 – 1917 гг.). Мн., 1999.

11. Яцкевіч І. Думская тактыка Бунда ў Беларусі (1906-1910 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1997, № 3.

12. Забаўскі М. М., Пуцік У. С. Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі (1906-1917 гг.). Мн., 1998.